*Określenie „wie i rozumie" należy odnieść do standardów wymagań z zakresu wiedzy o języku; określenie „zna i rozumie" należy odnieść do standardów wymagań z zakresu wiedzy o literaturze i kulturze.

## II. KORZYSTANIE Z INFORMACJI

**Zdający potrafi:**

| POZIOM PODSTAWOWY | POZIOM ROZSZERZONY |
|---|---|
| W ZAKRESIE ODBIORU TEKSTÓW KULTURY | |
| 1) rozpoznać różne rodzaje znaków w prezentowanych wytworach kultury; rozpoznać, co jest, a co nie jest systemem znaków; wskazać w przedstawionym materiale (na obrazie, w tekście, fragmencie filmu) znaki różnego rodzaju,<br>2) wskazać w tekście określone formy wymowy, formy fleksyjne i połączenia wyrazowe: rozpoznać formy fleksyjne wyrazów różnych części mowy, rozpoznać i nazwać podstawowe związki składniowe,<br>3) rozpoznać wieloznaczność słowa i odróżnić ją od homonimiczności form; pokazać poprawne i manipulacyjne posługiwanie się wyrazami wieloznacznymi,<br>4) odróżnić tekst językowo poprawny od niepoprawnego,<br>5) wskazać istotne cechy języka mówionego i pisanego oraz rozpoznać (według określonych cech), czy tekst jest mówiony, czy pisany,<br>6) wskazać i rozpoznać w tekście literackim elementy dialektu,<br>7) wskazać podstawowe cechy językowe poszczególnych stylów; rozpoznać (według określonych cech), w jakim stylu pisany jest określony fragment,<br>8) odróżniać intencje aktu mowy, np. rozkaz od prośby, pytanie od stwierdzenia; wydobyć ukryte cechy aktu mowy; dostrzec w tekście wypowiedzi ironię, sarkazm, prowokację,<br>9) rozpoznać funkcje określonych tekstów,<br>10) rozpoznać w tekście językowe środki perswazji i manipulacji: odróżnić środki etyczne od nieetycznych, szczerość od nieszczerości wypowiedzi, pokazać określone środki perswazji językowej, wskazać tekst zawierający manipulację językową, odróżniać zdania o faktach od zdań będących interpretacją faktów,<br>11) wskazać, na czym polega istota pokrewieństwa językowego, | jak na poziomie podstawowym oraz:<br><br>1) wyróżnić w tekście związki frazeologiczne,<br>2) w podanym tekście rozpoznać wyrazy zapożyczone, |
| W tekstach publicystycznych i popularnonaukowych: | |
| 12) odczytać dosłowne i metaforyczne znaczenia wyrazów,<br>13) odczytać znaczenia frazeologizmów,<br>14) odczytać sens fragmentów (zdań, grupy zdań, akapitu),<br>15) wyodrębnić tezę (główną myśl) całego tekstu,<br>16) wyodrębnić argumenty i wnioski,<br>17) rozpoznać zasadę kompozycyjną tekstu i jej funkcję,<br>18) rozpoznać i określić typ nadawcy i typ adresata tekstu,<br>19) nazwać funkcję tekstu, | jak na poziomie podstawowym, |

| | |
|---|---|
| 20) rozpoznać charakterystyczne cechy stylu i języka tekstu; nazwać środki językowe i ich funkcję w tekście,<br>21) rozpoznać cechy gatunkowe tekstu,<br>22) odtworzyć informacje sformułowane wprost; przetworzyć informacje, np. porządkować i hierarchizować, wskazywać przyczyny i skutki, oddzielać informacje od opinii, | |
| W tekstach literackich: | |
| 23) rozpoznać tematy, wątki, motywy,<br>24) rozpoznać bohatera i sposoby jego kreowania w utworze,<br>25) odczytać treści dosłowne i ukryte utworu,<br>26) dostrzec różnice między fikcją literacką i prawdą historyczną,<br>27) rozpoznać aluzje literackie, znaki i symbole kulturowe, np. biblijne, antyczne,<br>28) rozpoznać w tekście językowe środki artystycznego wyrazu,<br>29) określić funkcję środków językowych w utworze,<br>30) określić funkcję aktów mowy,<br>31) określić funkcję dialektyzmów, archaizmów, słownictwa środowiskowego w tekście literackim,<br>32) stosować konteksty właściwe utworów,<br>33) rozpoznać przybliżony czas powstania utworu,<br>34) rozpoznać konwencję literacką utworu,<br>35) rozpoznać styl utworu,<br>36) rozpoznać cechy gatunkowe utworu,<br>37) rozpoznać parafrazę, parodię, trawestację,<br>38) dostrzec cechy wspólne utworów,<br>39) dostrzec związki między utworem literackim i innymi dziełami sztuki,<br>40) dostrzec w utworze wartości charakterystyczne dla epoki,<br>41) rozpoznać powiązania utworów z historią,<br>42) dostrzec etyczne i estetyczne wartości utworu,<br>43) dostrzec wartości uniwersalne, narodowe,<br>44) rozpoznać funkcję utworu, np. dydaktyczną, kompensacyjną, formacyjną,<br>45) odróżnić osobiste sądy związane z odbiorem utworu od sądów utrwalonych w tradycji. | jak na poziomie podstawowym oraz:<br>3) określić funkcję występujących w utworze tematów, toposów, motywów,<br>4) określić funkcję (ideową i kompozycyjną) aluzji literackiej, znaku kulturowego, np. biblijnego antycznego,<br>5) dostrzec związki między różnymi warstwami utworu,<br>6) dostrzec związki dzieła literackiego z kulturą i filozofią epoki,<br>7) odczytać znaki tradycji biblijnej, chrześcijańskiej, antycznej,<br>8) rozpoznać tradycję literacką,<br>9) dostrzec przemiany gatunku literackiego,<br>10) rozpoznać środki językowe, decydujące o swoistości wypowiedzi indywidualnej,<br>11) dostrzec cechy języka charakterystyczne dla danej epoki i stylu czytanych utworów,<br>12) dostrzec strukturę artystyczną utworu,<br>13) odczytać odniesienia do innych dziedzin sztuki. |

## III. TWORZENIE INFORMACJI

**Zdający potrafi:**

| POZIOM PODSTAWOWY | POZIOM ROZSZERZONY |
|---|---|
| W ZAKRESIE TWORZENIA TEKSTU WŁASNEGO | |
| 1) poprawnie mówić i pisać, ze świadomością tego, dlaczego tak właśnie to robi,<br>2) wypowiadać się ze świadomością intencji swojej wypowiedzi,<br>3) napisać krótki tekst w określonym stylu,<br>4) skonstruować tekst mający przekonać kogoś do czegoś,<br>5) publicznie zabrać głos, stosując podstawowe zasady retoryczne,<br>6) zachować się zgodnie z zasadami językowego savoir-vivre'u,<br>7) napisać spójny tekst na określony temat,<br>8) gromadzić, selekcjonować materiał, hierarchizować argumenty; formułować hipotezy i wnioski,<br>9) interpretować utwór na podstawie jego analizy,<br>10) stosować podstawowe pojęcia z zakresu historii literatury, teorii literatury i nauki o języku,<br>11) przywołać właściwe konteksty, np. odnieść dzieło do biografii autora, filozofii, religii, życia, człowieka,<br>12) streszczać, parafrazować, cytować, komentować, wnioskować,<br>13) formułować i uzasadniać opinie,<br>14) porównywać dzieła,<br>15) prezentować własne przeżycia wynikające z kontaktów ze sztuką,<br>16) uczestniczyć w dialogu, dyskusji, broniąc swojego stanowiska,<br>17) mówić i pisać z dbałością o estetykę wypowiedzi, | jak na poziomie podstawowym oraz:<br>1) redagować własną wypowiedź zgodnie z cechami gatunku i zamierzoną funkcją tekstu (rozprawki, recenzji, interpretacji utworu literackiego lub jego fragmentu, interpretacji porównawczej),<br>2) interpretować funkcję występujących w dziele tematów, motywów,<br>3) integrować wiedzę z zakresu historii literatury, teorii literatury, językoznawstwa i nauki o kulturze,<br>4) oceniać według wskazanych przez siebie kryteriów, |
| W ZAKRESIE SAMOKSZTAŁCENIA | |
| 18) korzystać z klasycznych źródeł informacji: słowników, encyklopedii,<br>19) korzystać z Internetu i innych elektronicznych źródeł informacji,<br>20) wykonać opis bibliograficzny,<br>21) wyszukać literaturę przedmiotu, dokonać jej selekcji według określonych kryteriów; wykorzystać ją do opracowania tematu,<br>22) scalać zdobyte informacje w różne formy wypowiedzi,<br>23) notować, sporządzić plan, konspekt,<br>24) gromadzić teksty literackie i inne teksty kultury, poznane w toku lektury własnej, stanowiące odniesienie do lektur poznanych w szkole,<br>25) analizować i korygować błędy językowe popełnione przez siebie lub dostrzeżone w czytanych tekstach. | jak na poziomie podstawowym oraz:<br>5) tworzyć zestawy bibliograficzne na określony temat,<br>6) sporządzać przypisy,<br>7) tworzyć bazy danych,<br>8) sporządzać zapis komputerowy, audio i wideo. |

Tematy wypracowań na egzamin pisemny odbywający się **w maju 2008 roku** będą formułowane na podstawie *Standardów wymagań egzaminacyjnych* i w związku z listą lektur podaną na następnej stronie:

**na poziomie podstawowym**

1. Аповесць пра Грунвальдскую бітву (з "Хронікі Быхаўца")
2. Статут Вялікага княства Літоўскага (фрагменты)
3. Францыск Скарына – "Прадмова да ўсёй Бібліі"
4. Народныя песні: "Купалінка", калядкі
5. Народныя паданні і легенды: "Расказ пра Рагнеду"
6. Кастусь Каліноўскі – "Мужыцкая праўда" (№ 3), "Пісьмы з-пад шыбеніцы"
7. Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч – "Пінская шляхта" (фрагменты)
8. Францішак Багушэвіч – Прадмова да "Дудкі беларускай"
9. Максім Багдановіч – "Пагоня", "Зорка Венера", "Зімой"
10. Янка Купала – "Спадчына", "І прыйдзе", "Курган"
11. Якуб Колас – "Новая зямля" (фрагменты), "У палескай глушы" (фрагменты)
12. Максім Танк – "Рукі маці", "Голас"
13. Васіль Быкаў – "На чорных лядах" (фрагменты), "Аблава" (фрагменты)
14. Уладзімір Караткевіч – "Зямля пад белымі крыламі" (фрагменты), "Быў. Ёсць. Буду.", "На Беларусі Бог жыве"
15. Барыс Сачанка – "Чаравікі-туфелькі", "Дарога праз лес"
16. Алесь Разанаў – "Парог", "У парку"
17. Натальля Арсеннева – "Малітва", "Восень"
18. Надзея Артымовіч – "Паэты паміраюць..."
19. Ян Чыквін – "А дом наш недзе"
20. Алесь Барскі – "Маці", "Я сын зямлі беластоцкай"
21. Сакрат Яновіч – "Гасцінец", "Доня-дочанька"
22. Віктар Швед – "Бацькоўскі парог"

**na poziomie rozszerzonym**

1. Летапіс "Пахвала вялікаму князю Вітаўту"
2. Мікола Гусоўскі – "Песня пра зубра" (фрагменты)
3. "Прамова Мялешкі"
4. "Песня беларускіх жаўнераў 1794 года"
5. Ян Баршчэўскі – "Белая сарока"
6. Адам Міцкевіч – "Пан Тадэуш" (фрагменты, у перакладзе Браніслава Тарашкевіча)
7. Уладзіслаў Сыракомля – "Бусел"
8. Цётка (Алёйза Пашкевіч) – "Навагодні ліст"
9. Максім Багдановіч – "Апокрыф", "Слуцкія ткачыхі", "Санет"
10. Янка Купала – "Незалежнасць", "Прарок", "Тутэйшыя"
11. Якуб Колас – "Новая зямля"
12. Максім Гарэцкі – "Дзве душы", "Фантазія"
13. Уладзімір Жылка - "Беларусь"
14. Францішак Грышкеміч – "Малітва"
15. Уладыслаў Казлоўшчык – "Ня ў на вясна"
16. Ларыса Геніюш – "Споведзь" (фрагменты)
17. Масей Сяднёў – "Малітва",
18. Янка Брыль – "Вячэрняе" (фрагменты пра польска-беларускія адносіны, абарону Гдыні ў 1939 г.)
19. Васіль Быкаў – "Два маэстры"
20. Уладзімір Арлоў – "Незалежнасць"
21. Уладзімір Караткевіч – "Дзікае паляванне караля Стаха" (фрагменты)
22. Надзея Артымовіч – "Ікона", "На небасхіле"
23. Сакрат Яновіч – "Беларускаму слову"
24. Віктар Швед – "Беларуская мова", "Лёс чалавечы"
25. Ян Чыквін – "Крык начны савы"
26. Алесь Барскі – "Селянін, як тварэц"

Tematy wypracowań na egzamin pisemny odbywający się **od maja 2009 roku** będą formułowane na podstawie *Standardów wymagań egzaminacyjnych* i w związku z podaną niżej listą lektur:

## na poziomie podstawowym

1. Аповесць пра Грунвальдскую бітву (з Хронікі Быхаўца)
2. Францыск Скарына – Прадмова да ўсёй Бібліі
3. Песні - Купалінка, калядкі (адна на словы Віктара Шведа)
4. Паданні і легенды - Рагнеда і Уладзімір
5. Кастусь Каліноўскі – Пісьмы з-пад шыбеніцы
6. Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч – Пінская шляхта
7. Францішак Багушэвіч- Прадмова да "Дудкі беларускай", Хмаркі
8. Максім Багдановіч – Пагоня, Зорка Венера, Слуцкія ткачыхі, Санет, Па- над белым пухам вішняў
9. Янка Купала – Спадчына, Не шукай, І прыйдзе, Курган

10 Якуб Колас – Адзінокае дрэва, Новая зямля (раздзелы: Леснікова пасада, Воўк, Каляды, Вялікдзень, Смерць Міхала), У палескай глушы (скарочана - з падручніка да II класа)

11. Кузьма Чорны- Макаркавых Волька
12. Максім Танк – Рукі маці, Ave Maria, Шчасце,***О,як лёгка ісці, ***І радасць - ніякая радасць, а горыч
13. Васіль Быкаў – Калі хочацца жыць, Аблава (скарочана - з "Хрэстаматыі да сярэдніх школ)
14. Уладзімір Караткевіч – Зямля пад белымі крыламі (фрагменты з "Хрэстаматыі для сярэдніх школ), Багдановічу, На Беларусі Бог жыве
15. Іван Мележ – Людзі на балоце (частка I, раздзел V)
16. Барыс Сачанка – Дарога праз лес, Вярніся, вярніся
17. Рыгор Барадулін – Трэба дома бываць часцей
18. Сяргей Грахоўскі – Першае каханне
19. Алесь Разанаў – Снег, Дзічка
20. Наталля Арсеннева – Малітва, Восень, Шчасце, Між берагамі
21. Ларыса Геніюш- Князь Усяслаў Чарадзей, Бацькаўшчына, Споведзь (частка I- Жлобаўцы)
22. Масей Сяднёў- Айчына
23. Ян Чыквін – А дом наш недзе, Партрэт з памяці (з "Хрэстаматыі для сярэдніх школ)
24. Алесь Барскі – Твой твар, Я сын зямлі беластоцкай
25. Сакрат Яновіч – Гасцінец, Элегія пакінутага гнязда
26. Віктар Швед – Лёс чалавечы, Прамінанне
27. Мікалай Гайдук – Мера чалавечнасці

## na poziomie rozszerzonym

1. Статут Вялікага княства Літоўскага – раздзелы: Сямейнае права, Спадчынае права, Ахова прыроды
2. Мікола Гусоўскі –Песня пра зубра (урывак з падручніка да I класа)
3. Цётка – Мора
4. Максім Багдановіч – Апокрыф, ***Я хацеў-бы спаткацца з Вамі на вуліцы, Хто мы такія?
5. Янка Купала – Незалежнасць, Прарок, Тутэйшыя, Больш самачыннасці
6. Якуб Колас – Новая зямля
7. Максім Гарэцкі – Фантазія
8. Францішак Грышкевіч – Малітва
9. Уладыслаў Казлоўшчык – Ня ў нас вясна
10. Ларыса Геніюш – ***Крывёй напоўніліся поймы рэк
11. Масей Сяднёў – Малітва, Яе няма
12. Васіль Быкаў – Два маэстры, На чорных лядах, Сцяна (скарочана- з падручніка да III класа)

13.Уладзімір Арлоў – Незалежнасць, Час чумы
14.Уладзімір Караткевіч – Жанчыне з бэзам, Быў.Ёсць.Буду, Дзікае паляванне караля Стаха (урывак з падручніка да III класа)
15.Аляксей Дудараў –Вечар
16.Алесь Разанаў –Дуб, Спадчына
17.Надзея Артымовіч – ***ікона, ***паэты паміраюць тады
18.Сакрат Яновіч – Дзённікі(1987-1993)

Uwaga: w przypadku interpretacji porównawczej tematy na poziomie rozszerzonym mogą zawierać jeden tekst z poziomu podstawowego, mogą także zobowiązywać do analizy i interpretacji utworów spoza listy zamieszczonej w *Informatorze*, ale utrzymanych w znanej uczniom poetyce lub konwencji.

# VI. PRZYKŁADOWE TEMATY NA USTNĄ CZĘŚĆ EGZAMINU

Przykłady ilustrują koncepcję formułowania tematów na ustną część egzaminu, sprawdzającą umiejętność mówienia w języku mniejszości narodowej. Zostały zgrupowane w trzech kategoriach i stanowią przykładowy zbiór tematów. Wszystkie mają charakter ogólny i zostawiają maturzyście swobodę wyboru treści.
Abiturient ma obowiązek:

- Wybrać lekturę, literaturę krytyczną (opracowania), materiały pomocnicze, formę prezentacji,
- Sformułować tezę i argumenty,
- Sporządzić bibliografię.

## 1. Літаратура

1. Літаратура беларусаў у II Рэчыпаспалітай. Схарактарызуй на прыкладах.
2. Вёска як асноўная прастора жыцця чалавека. Паразважай на выбраных прыкладах.
3. Біяграфія – ключ да адчытання творчасці выбранага пісьменніка.
4. Вобраз інтэлігента ў беларускай літаратуры. Прааналізуй на выбраных прыкладах.
5. Якія героі беларускай літаратуры могуць быць узорамі для сучаснага маладога чытача? Дакажы і абгрунтуй на прыкладах.
6. Свет правінцыі ў творах беларускіх пісьменнікаў. Паразважай на выбраных прыкладах.
7. Мая малая айчына. Паразважай выкарыстоўваючы літаратурныя творы.
8. Польска–беларускія пісьменнікі і іх роля ў адраджэнні беларускай літаратуры.
9. Прадстаў выбраныя постаці і дакажы іх ролю.
10. Лёс дзіцяці ў беларускай літаратуры. Прадстаў праблему на аснове выбраных твораў.
11. Партрэт жанчыны ў беларускай літаратуры. Прадстаў на аснове выбраных твораў.
12. Аратарская проза ў розных гістарычных перыядах. Прааналізуй на аснове выбраных твораў.
13. Беларуская мемуарная літаратура. Прадстаў яе значэнне для народа на выбраных прыкладах.

## 2. Суадносіны паміж рознымі відамі мастацтва

1. Культура і літаратура беларусаў у II Рэчыпаспалітай. Схарактарызуй на прыкладах.
2. Фальклор як інспірацыя для пісьменнікаў і мастакоў. Прадстаў на выбраных прыкладах.
3. Фальклор выбранай вёскі нашага рэгіёну. Прадстаў абрады і вераванні.
4. Музычнае багацце Усходняй Беласточчыны. Раскажы пра дзейнасць і дасягненні беларускіх калектываў.
5. Беларускі мастацкі твор і яго фільмовая або тэатральная пастаноўка. Прадстаў на выбраным творы.
6. Характэрныя рысы беларускай архітэктуры нашага рэгіёну. Прадстаў на выбраных прыкладах.
7. Спецыфіка дзейнасці беларускіх мастакоў Падляшша. Схарактарызуй на выбраных прыкладах.

8. Мая малая айчына. Паразважай выкарыстоўваючы літаратурныя творы, публіцыстыку і гістарычныя факты.
9. Беларуская сучасная музыка. Прадстаў на аснове выбраных твораў і выканаўцаў.
10. Беларускасць у маёй сям'і. Прадстаў праблему выкарыстоўваючы быт, абраднасць, мову, літаратуру, сведамасць.

## 3. Мова

1. Беларуская мова ў маёй ваколіцы: рысы, стан, іншамоўныя ўплывы. Прадстаў эфекты свайго назірання.
2. Мова сродкаў масавай інфармацыі. Прааналізуй асаблівасці падляшскай беларускай мовы( памылкі, дыялекты,паланізмы і іншыя).
3. Творчае выкарыстанне гаворак, прыказак, прымавак, фразеалагізмаў у мастацкай літаратуры. Прадстаў на выбраных прыкладах.
4. Мясцовыя імёны, прозвішчы, клічкі і іх паходжанне. Прааналізуй на аснове выбранай мясцовасці, рэгіёну.
5. Беларуская тапанімія ў тваім рэгіёне, мясцовасці. Прадстаў яе этымалогію і значэнне.
6. Роля беларускіх мовазнаўцаў у развіцці мовы. Раскажы выкарыстоўваючы вядомыя табе постаці і іх мовазнаўчыя дасягненні.
7. Беларуская мова на працягу апошняга стагоддзя. Выкажы свой погляд на розныя этапы яе развіцця (”лацінка”, ‟тарашкевіца”, ‟наркомаўка”).

# VII. PRZYKŁADOWE ARKUSZE I SCHEMATY OCENIANIA






**Miejsce na naklejkę z kodem szkoły**

*dysleksja*

# EGZAMIN MATURALNY Z JĘZYKA BIAŁORUSKIEGO

## POZIOM PODSTAWOWY

**Czas pracy 170 minut**

**Instrukcja dla zdającego**

1. Sprawdź, czy arkusz egzaminacyjny zawiera 14 stron. Ewentualny brak zgłoś przewodniczącemu zespołu nadzorującego egzamin.
2. Pisz czytelnie. Używaj długopisu/pióra tylko z czarnym tuszem/atramentem.
3. Nie używaj korektora, a błędne zapisy wyraźnie przekreśl.
4. Pamiętaj, że zapisy w brudnopisie nie podlegają ocenie.
5. Na karcie odpowiedzi wpisz swoją datę urodzenia i PESEL. Zamaluj ■ pola odpowiadające cyfrom numeru PESEL. Błędne zaznaczenie otocz kółkiem i zaznacz właściwe.
6. Postępuj podobnie, zaznaczając odpowiedzi w części karty przeznaczonej dla zdającego. Tylko odpowiedzi zaznaczone na karcie będą oceniane.

***Życzymy powodzenia!***

Za rozwiązanie wszystkich zadań można otrzymać łącznie **70 punktów**

*Część I – 21 pkt*
*Część II – 49 pkt*

**Wypełnia zdający przed rozpoczęciem pracy**

**PESEL ZDAJĄCEGO**

**KOD ZDAJĄCEGO**

# CZĘŚĆ I – ROZUMIENIE CZYTANEGO TEKSTU

**Прачытай уважліва тэкст і адкажы на пытанні**

Анатоль Клышка

***Францыск Скарына, альбо Як да нас прыйшла кніга***

1. У Італіі, у адным з найстарэйшы у свеце Падуанскім універсітэце ёсць славутая “Зала сарака”. У “Зале сарака” на сценах сорак вялікіх партрэтаў слаўных з найслаўнейшых. Сярод іх другі ад покуці[1], каля кафедры Галілея, – Францішак Скарына. Так за тысячы кіламетраў ад Беларусі, у далёкай Італіі, ушаноўваецца памяць аб нашым першадрукару Францыску Скарыне. Менавіта са Скарынавых рук без мала пяцьсот гадоў таму назад усходняе славянства атрымала першую друкаваную кнігу. [...]
2. Пад зіму 1504 года Францішка Скарыну можна было ўбачыць у Кракаве. На славянскіх землях тады было толькі два універсітэты: у чэшскай Празе і ў польскім Кракаве. Кракаў быў бліжэй... Ды і універсітэт яго быў крыху абжыты палачанамі. Кракаўскі універсітэт быў вядомы сваімі выдатнымі вучонымі – астраномамі, матэматыкамі. З паў-Еўропы сцякаліся сюды шкаляры. Асабліва шмат было з Венгрыі, Нямеччыны, Чэхіі. [...]
3. Папулярнасці універсітэта спрыяла тое, што ён, як на той час, быў даволі дэмакратычны. Палову яго выхаванцаў складалі дзеці рамеснага і гандлёвага люду; дзяцей сялян вучылася тут аж да 10 працэнтаў, што было “незвычайна шмат” у параўнанні з тагачаснымі такімі ж установамі феадальнай Еўропы. У тыя гады студэнтаў налічвалася ўжо да трох тысяч. Хоць як на ўсю Польшчу ды прылеглыя Літву, Беларусь, Украіну не дужа шмат. Бо ў чэшскай Празе ва універсітэце налічвалася ў тыя часы 7-8 тысяч студэнтаў.[...]
4. Асноўная нагрузка клалася тады на памяць, і ўсё вырашала добрая памяць. Завучыць, зазубрыць, убіць у галаву, запомніць – вось што павінен быў рабіць студэнт сярэдневяковага універсітэта. У нейкай ступені гэта можна і зразумець. Спадзявацца тады, што ў цябе некалі будзе тая ці іншая кніга, – не даводзілася. Шкаляр часта нават выбіраў той ці іншы факультэт толькі таму, што ў яго аказвалася пэўная кніга. [...]
5. Па-рознаму мінаў у бурсе час. Адны рэзаліся ў карты, другія – у шахматы ці шашкі. Трэція сур'ёзна сядзелі над кнігамі. Часта можна было бачыць, як адзін студэнт ушываў свайму багацейшаму сябру гузікі або перапісваў для яго лекцыі. Былі ж такія, якія проста адбывалі лекцыі, ніколі не здаючы ніякіх экзаменаў. [...]
6. Бывала і так, што студэнт, узяўшы збанок, ішоў жабраваць. Так, так, жабраваць. Для студэнта гэта не лічылася асаблівым грахом. Ён жа пасля, вывучыўшыся, сваімі ведамі аддасць народу больш, чым тое, што яму цяпер ахвяруюць. І некаторыя са студэнтаў, каб не марнаваць часу, адразу ішлі пад сядзібу, дзе выхоўваліся каралеўскія дзеці. Ксёндз-выхаваўца, высунуўшыся з акна, задаваў шкалярам некалькі пытанняў, каб спраўдзіць, ці не зноў пад марку студэнтаў прыцягнуліся сюды звычайныя жабракі. Калі студэнты адказвалі слаба, няўпэўнена, то для ксяндза гэта была прычэпка палічыць іх жабракамі і адмовіць у міласціне. Таму ў групе павінен быў быць і добры студэнт, хай сабе і не зусім бедны, але які выручыў

[1] Покуць – тут: ганаровае месца

бы кампанію. Калі ксёндз упэўніваўся, што гэта ўсё ж студэнты, ён пытаўся, хто ў чым мае патрэбу.[...]

7. Кожны прадмет засвойваўся траякім спосабам: праз лекцыі, калёквіумы, дыспуты. Штосуботы адбываліся дыспуты. Яны таксама мелі навучальнае значэнне. У вялікую залу збіраліся студэнты і выкладчыкі ўсяго факультэта. Пасля таго як пэўны магістр браў слова і высоўваў нейкую думку, выступалі другія настаўнікі, аспрэчвалі яго сцверджанне, высоўваючы адначасова свае, новыя. Вырашалі ж спрэчку пад кіраўніцтвам выкладчыкаў добра падрыхтаваныя студэнты. Такія дыспуты былі неблагою школаю. Калі ўлічыць, што кніг было няшмат, то студэнт з такіх спрэчак, несумненна, даведваўся нямала новага, ды і вучыўся, як трэба аспрэчваць (а не проста адкідаць!) тую ці іншую думку, якую ты лічыш памылковаю, і аргументавана даказваць, пераканаўча даводзіць тую, якую лічыш правільнаю. [...]

8. Чаму Скарына апынуўся ў Празе, чаму менавіта гэты горад выбраў ён для друкавання кнігі? Мяркуюць, што Францыска пасля  яго вяртання з Падуі (у Падуанскім універсітэце Скарына здае экзамен на званне доктара лекарскіх навук) кароль Сігізмунд I мог запрасіць сакратаром пры перагаворах польскага, чэшскага і венгерскага каралёў з імператарам Максіміліянам I у Вене. Але, пэўна ж, Прага прыцягвала тым, што ў ёй ужо друкавалі кнігі на роднай мове чэхаў, што адсюль можна было наладзіць сувязь з такімі цэнтрамі еўрапейскага кнігадруку, як Нюрнберг, Аусбург, Венецыя. [...] Дарэчы, у Чэхіі якраз незадоўга, за 18 гадоў перад гэтым, пачынаюць уводзіць першыя папяровыя млыны – у Празе і Збраславе. Можна было мець танную паперу. [...]

9. 6 жніўня 1517 года ў чэшскай Празе выйшаў у свет Скарынаў “Псалтыр”, а пазней і яшчэ 22 біблейскія кнігі. Да ўсіх іх наш першадрукар даў агульны тытульны аркуш: “Библия руска выложена доктором Франциском Скориною из славного града Полоцька...”. Кожны выпуск меў прадмову і пасляслоўе, у якіх пісалася, хто, дзе, калі і дзеля чаго выдаў гэтую кнігу. [...]

10. Скарына перакладае і выдае гэтыя кнігі не дзеля таго, каб “ратаваць” душу сабе і сваім чытачам, а таму, што бачыць у кнігах матэрыял для “навучання сямі вызваленых навук дастатковы”. У прадмове да “Псалтыра” ён піша, што гэта «детем малым як початок всякое доброе науки грамоты...». І пасля, перабіраючы па чарзе, ён зазначае, якая з кніг да чаго прыдатная, з якой можна даведацца пра ваенныя, гераічныя справы, а з якой умець арыфметыку, а з якой землямер’е, астраномію – навуку пра зоркі і гэтак далей. У гэтым пералічэнні сямі вызваленых навук чуваць Скарынаў клопат быць універсітэтам для простых людзей, даць ім у рукі кнігу, якая была б  энцыклапедыяй у розных галінах ведаў.[...]

11. Недзе каля 1520 года Францыск Скарына пераязджае ў Вільню – сталіцу Вялікага княства Літоўскага.[...] Неўзабаве пры рынку запрацавала Скарынава друкарня. [...] І вось Вільня трымае ў руках першыя  друкаваныя кнігі ў гэтых землях – “Малую падарожную кніжыцу” і “Апостал” [...]. Добра прадуманы фармат выданняў. Ужо сваім выглядам “Апостал” кажа, што ён разлічаны не для царкоўнай службы, а для хатняга чытання. Памер невялікі – самы раз, каб узяўшы ў рукі кнігу, прысесці з ёю ў нядзельку за сталом. І зусім кішэнны фармат у “Малой падарожнай кніжыцы”, разлічанай на купцоў і рамеснікаў, якім не раз даводзілася выпраўляцца ў далёкую дарогу...З гэтага боку асабліва цікава апошняя частка “Малой падарожнай кніжыцы”, дзе змешчаны розныя каляндарныя, астранамічныя і нават медыцынскія звесткі – усё тое, што найнеабходным было чалавеку ў дарозе. [...]

**12**. Францыск Скарына, як у Празе, так цяпер у Вільні, выдае свае кнігі з асветніцкімі мэтамі для небагатых людзей, як ён сам піша, «людзям паспалітым на добрае навучанне». [...]

*Родная крыніца,* Мінск 1986, стар. 43-64.

## Заданні да тэксту

### Заданне 1. *(1 пункт)*

**У Падуанскім універсітэце ў "Зале сарака" ёсць партрэт Францыска Скарыны. Высветлі, чаму Скарына належыць да групы найслаўнейшых людзей свету. Карыстайся 1 абзацам.**

..............................................................................................................................

..............................................................................................................................

..............................................................................................................................

..............................................................................................................................

### Заданне 2. *(2 пункты)*

**Якія інфармацыі адносна Кракаўскага універсітэта пададзеныя ў 2 і 3 абзацах?**

..............................................................................................................................

..............................................................................................................................

..............................................................................................................................

..............................................................................................................................

### Заданне 3. *(2 пункты)*

**Карыстаючыся 3 абзацам, растлумач сваімі словамі тэрмін "роўнасць" і напішы, ў чым заключалася роўнасць сярод студэнтаў Кракаўскага універсітэта.**

..............................................................................................................................

..............................................................................................................................

..............................................................................................................................

..............................................................................................................................

### Заданне 4. *(2 пункты)*

**У 4 абзацы аўтар уводзіць слова "шкаляр". Раскрый значэнне гэтага слова і падбяры сінонімы.**

..............................................................................................................................

..............................................................................................................................

..............................................................................................................................

..............................................................................................................................

**Заданне 5.** ***(1 пункт)***
**Што абазначае фразеалагізм “сур’ёзна сядзець над кнігамі”.**

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

**Заданне 6.** ***(2 пункты)***
**Падай прыклады бесклапотнага студэнцкага жыцця, а таксама яго нягоды (цяжкасці). Карыстайся 5 і 6 абзацамі.**

| прыклады бесклапотнага жыцця | цяжкасці жыцця |
|---|---|
| | |

**Заданне 7.** ***(2 пункты)***
**На аснове 7 абзаца растлумач сваімі словамі значэнне тэрміна “дыспуты”.**

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

**Заданне 8.** ***(2 пункты)***
**Карыстаючыся 8 абзацам, высветлі, чаму менавіта Прагу выбраў Скарына для друкавання кніг.**

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

.............................................................................................................................................

**Заданне 9.** ***(2 пункты)***
**Высветлі, чаму дзеяслоў “ратаваць”, якім аўтар карыстаецца ў 10 абзацы, узяты ў двукоссе.**

.............................................................................................................................................

............................................................................................................................................

**Заданне 10.** ***(1 пункт)***
**На аснове 10 абзаца выясні значэнне слоў “быць універсітэтам для простых людзей”.**

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

**Заданне 11.** ***(1 пункт)***
**Якія інфармацыі адносна (на тэму) Скарыны змешчаны ў абзацах 9., 11.**

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

**Заданне 12.** ***(2 пункты)***
**У 12 абзацы аўтар піша: “Скарына [...] выдае свае кнігі з асветніцкімі мэтамі”. На аснове 10 і 11 абзацаў сфармулюй 2 мэты і запішы іх.**

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

**Заданне 13.** ***(1 пункт)***
**Тэкст А. Клышкі гэта:**
**а)** фельетон
**б)** папулярна-навуковы артыкул
**в)** навуковая праца

# CZĘŚĆ II – PISANIE WŁASNEGO TEKSTU

**Ta część zawiera dwa tematy sprawdzające umiejętność tworzenia własnego tekstu w związku z tekstem literackim zamieszczonym w arkuszu. Wybierz jeden z nich i napisz wypracowanie. Wybrany temat podkreśl.**

**Тэма 1:**
**На аснове вобразаў герояў ”Аблавы” Васіля Быкава прааналізуй праблему віны ў часе калектывізацыі.**

Васіль Быкаў, ***Аблава***

Усё астатняе – збожжа, бульба, майно[1], нажытае за гады потам і працай, рэквіравалася на карысць сельсавета Яно няхай бы рэквіравалася на грамадскую патрэбу, думаў затым Хведар, але ж яны рэквіравалі найбольш для таго, каб не даць ім, небаракам, у іх дальнюю гаротную дарогу, каб яны хутчэй там памерлі ад голаду і марозу. Шасцігадовая Волечка якраз надзела новыя чорныя валёначкі, што ён справіў ёй у мястэчку з леташняй воўны, дзяўчынка ўсю зіму ашчаджала іх, надзела, можа, якія разы тры, болей абыходзілася старэнькімі, лапленымі-пералапленымі, якія меркавалася данасіць да вясны і выкінуць, але як стала збірацца ў гэта свой шлях, маці сказала Волечцы надзець новыя – усё ж выпраўляліся ў людзі, і маці хацелася, каб дзяўчынка выглядала па-людску. Волечка паслухалася, на сваю бяду, і тады стаяла ля ганка на снезе ў зграбненькіх чорных валёначках. Мусіць, дарма стаяла. Кінуліся тыя валёначкі ў хцівыя вочы ўпаўнаважаных, і старэйшы з іх, чалавек у чорным паўшубку, нешта загадаў Сокуру Івану. Сокур трохі памяўся, перасмыкнуў голеным тварам, але падступіў да дзяўчынкі і перадаў загад. Волечка паслухмяна здзела адзін чорны валёначак, затым другі і засталася на снезе ў адных панчошках, пакуль маці, заплакаўшы, не прынесла ёй з сенцаў старыя. Хведар, згледзеўшы тое, сказаў сабе: «Ая-я-я-я!», на што Сокур, учуўшы, зноў перасмыкнуў тварам і моўчкі цепнуў плячыма: маўляў, што зробіш? Ці мая гэта воля? Ён узяў тыя чорныя маленькія валёначкі і насіў з сабою, пакуль яны збіралі бедныя клумкі на сані. Не, каб сказаць тым, з раёна: не па-боску гэта – разуваць малое, не ў цёплы ж край выпраўлялі – на поўнач, у маразы, на голад і здзек. Ды не, не сказаў. Так і паехала Волечка ў стаптаных валёначках і хадзіла ў іх яшчэ дзве зімы, і прастуджвалася, і хварэла. Аж покуль не прастудзілася ў апошні раз, калі ўжо нічога ёй не стала патрэбна. [...]

Малы Міколка быў жаласлівы да жывёлы. [...] А як вырас, мусіць жа, гэтак аддана палюбіў камсамол. Можа, і не сам камсамол, як тую гарластую мітусню, якой з захапленнем займаліся маладыя – ад суму і самоты, – седзячы зімой у цёмных, завеяных снегам вёсках. [...] З усёй іх ячэйкі асабліва актыўнічалі Міколка і ягоны аднагодак Шурка, адзіны сынок у бядняччкі-ўдавы Міхаліны. Аднойчы яны прынялі рэзалюцыю, каб зняць абразы. Канешне, дамагчыся таго ва ўсёй вёсцы, як ім хацелася, хлопцы не мелі сілы, тады пастанавілі зняць хоць бы ў сваіх бацькоў. Тое было прасцей, але, мусіць, таксама не надта, бацькі іх не дужа слухаліся. Хведар глядзеў на хлапечую задуму даволі памяркоўна – што тыя абразы! Праўда, вісяць у куце, нікому не замінаюць, але і карысці з іх таксама няма ніякай. А Ганула заўпарцілася, і Міколка яе ўгаворваў ад каляд да самага вялікага посту. Усё ж дамогся, аднойчы пазнімаў і абразы, і ручнікі з іх, замест павесіў партрэт Карла Маркса; ручнікоў, аднак,

---

[1] майно- mienie, dobytek

вешаць не стаў. З таго часу вісеў у куце барадаты чалавек, таксама ні карысці з яго, ні шкоды. Міколка ж быў задаволены, ну і добра.

І тут пад вясну выпадкам камсамольскі сакратар дазнаўся, што ў Шуркі застаўся адзін абраз, вісіць на покуці[1]. Міколка сабраў камісію з трох чалавек, і яны пайшлі ў хату да Шуркі абследаваць. Аказалася, што так яно і ёсць, як казалі: абраз архангела Гаўрыіла вісіць сабе, дзе і вісеў, Міхаліна, Шуркава маці, плача, нізашто не дае знімаць, і Шурка нічора зрабіць з ёй не можа, такі аказаўся мяккацельны камсамолец. Міколка тут паставіўся крута. Думалі, ён скіне абраз, а ён абраз не чапаў, а сабраў камсамольскі сход і, не зважаючы на даўняе сяброўства, дамогся, што Шурку выключылі з камсамола. Хведар трохі падзівіўся з таго і неяк увечары мякка папракнуў сына. Сказаў, ці не занадта сурова яны паставіліся да свайго ж вясковага хлопца, як Міколка яму адказаў з нечуванаю раней строгасцю ў голасе: «Камсамол такіх ашуканцаў сцірае ў парашок!» [...]

І як усё пачалося? Колькі ён думаў пра тое, як і з чаго пачалося, – выразнага адказу знайсці не мог. [...] Ён жа, Хведар, дык і не думаў ніколі, што яго можа напаткаць такі самы лёс, хоць і жыў збольшага спраўна, але ж які ён кулак? Адзін конь, дзве каровы, авечкі, свінчо – бадай як і ва ўсіх астатніх у Нядолішчы. [...] Але, мусіць, не тое вызначыла яго кулаком, а малатарня. [...]

Як цяпер помніцца, думку пра тое падаў сын Міколка. Тады ўжо ён быў ладны дзяцюк, увосень збіраўся на прызыў у Чырвоную Армію і лічыўся сакратаром камсамольскай ячэйкі ў Нядолішчы. [...]

І вось неяк увосень позненька ўвечары прыходзіць Міколка. Стомлены, згаладнелы, у гразкіх ботах, аказваецца, быў на нейкай нарадзе ў раёне. Маці хутчэй міску на стол, ён з'еў троху і кажа: «Бацька, а давай купімо малатарню. Ёсць такая магчымасць праз патрэбкааперацыю. Грошы можна не разам – у россрочку». Хведар адказаў не адразу, падумаў. [...] Уранку, як Міколка пабег па сваіх камсамольскіх справах, асцярожна параіўся з Гануляй і вырашыў: купім. Пакуль не перакупіў хто спрытнейшы з якой іншай вёскі.

Малатарню прыцягнулі на трэці дзень пасля пакроваў. [...] Але ўсё апраўдалася. Малацілі талакой, гаспадаркамі дзвюма ці трыма адразу, як калі складвалася. Хведар нікому не адмаўляў, меркавалі як хто хацеў, а плацілі, хто колькі мог. У залежнасці ад намалоту, канешне. Усё па добрай волі, што ж ён які эксплуататар для сваіх сяльчан? Мусіць, ён бы даў малаціць і дарма, але трэба былі грошы, усё ж малатарня каштавала не дзешава, і хоць узялі ў крэдыт, але сплочваць трэба было кожны квартал. Да каляд памалацілі ўсе суседзі і некаторая яго радня. Нават прывозілі з суседніх вёсак. Усім малаціў Роўба.

Нядоўга, аднак, пагрукацела на ягоным таку тая чырвоная малатарня. У наступную восень прыйшоў той самы сельсавецкі старшыня Сокур, з ім яшчэ нехта вусаты з раёна і апячаталі. Аказваецца, дапусціў ён эксплуатацыю, непрацоўны даход. «А як жа цяпер? Што будзе?» – пытаўся Хведар. «Што будзе, тое і будзе», – цьмяна адказаў вусаты, зашчапляючы свой пацёрты партфельчык. Яны ўдвух, не азіраючыся, пайшлі са двара, а ён моўчкі стаяў ля варот, ужо адчуваючы, што гэта – не страта малатарні. Гэта – пачатак і яшчэ большай бяды, што чорнай варонай закружылася над яго галавой.

Друкуецца паводле: Васіль Быкаў, *"Выбранае", Выдавецтва «Ураджай»,* Мінск 2001, стар. 167-244

[1] Покуць- месца, дзе знаходзяцца святыя абразы

**Тэма 2:**
**У які спосаб Максім Багдановіч паказвае адносіны паміж з'явамі прыроды і эмацыянальным светам у вершах *Зімой* і *Раманс*?**

Максім Багдановіч

### ***Раманс***

*Quand luira cette etoile, un jour,*
*La plus belle et la plus lointaine.*
*Dites-lui qu'elle eut mon amour,*
*O derniers de la race humaine,*
*Sally Prudhomme**

Зорка Венера ўзышла над зямлёю,
Светлыя згадкі з сабой прывяла...
Помніш, калі я спаткаўся з табою,
Зорка Венера ўзышла.
З гэтай пары я пачаў углядацца
Ў неба начное і зорку шукаў.
Ціхім каханнем к табе разгарацца
З гэтай пары я пачаў.
Але расстацца нам час наступае;
Пэўна, ўжо доля такая у нас.
Моцна кахаў я цябе, дарагая,
Але расстацца нам час.
Буду у далёкім краю я нудзіцца,
Ў сэрцы любоў затаіўшы сваю;
Кожную ночку на зорку дзівіцца
Буду ў далёкім краю.
Глянь іншы раз на яе, – у расстанні
Там з ёй зліём мы пагляды свае...
Каб хоць на міг уваскрэсла каханне,
Глянь іншы раз на яе...

**Калі аднойчы засвеціцца гэтая зорка,*
*Найпрыгажэйшая і найдалейшая*
*Скажыце ёй, што я кахаў яе,*
*О, апошнія з роду людскога.*
*Сюлі – Прудом (франц.)*

### ***Зімой***

Здароў, марозны, звонкі вечар!
Здароў, скрыпучы, мяккі снег!
Мяцель не вее, сціхнуў вецер,
І волен лёгкіх санак бег.

Як мары, белыя бярозы
Пад сінявой начной стаяць.
У небе зоркі ад марозу
Пахаладзеўшыя дрыжаць.

Вільготны месяц стуль на поле
Празрысты, светлы стоўп спусціў
І рызай срэбнаю раздолле
Снягоў сінеючых пакрыў.

Ўзрывайце ж іх санямі, коні!
Звіні, вясёлых бомаў медзь!
Вакол лятуць бары і гоні,
Ў грудзях пачала кроў кіпець.

Друкуецца паводле: Багдановіч Максім, *"Збор твораў у двух тамах", том 2,* Навука і тэхніка, Мінск 1968

# OCENIANIE
# POZIOM PODSTAWOWY

**Część I – rozumienie czytanego tekstu**

**Анатоль Клышка**
**Францыск Скарына, альбо Як да нас прыйшла кніга**

| Nr zad | Odpowiedzi | Maks. liczba pkt | Pkt cząstkowe | Uwagi |
|---|---|---|---|---|
| 1. | - Скарына каля 500 гадоў таму назад выдаў першую друкаваную кнігу на старабеларускай мове;<br>- быў першадрукаром на землях усходняга славянства. | 1 | 0 | |
| 2. | - у Кракаве вычыліся і працавалі вядомыя вучоныя (матэматыкі, астраномы ігд.)<br>- былі там студэнты амаль з усёй Еўропы (многіх краін)<br>- дэмакратычны характар (10% сялян, рамеснікаў)<br>- 3 тыс. студэнтаў | 2 | 0 | Uczeń może podać nazwy państw wymienione w tekście |
| 3. | Роўнасць-аднолькавасць (у грамадстве).<br>У Кракаўскім універсітэце роўныя правы на вучобу мелі прадстаўнікі ўсіх саслоўяў. Сялянскія дзеці, рамеснага<br>і гандлёвага люду вучыліся разам<br>з дзецьмі шляхецкага паходжання. | 2 | 1 | 1 pkt – za ogólne wytłumaczenie terminu<br>1 pkt – za odniesienie do tekstu |
| 4. | Шкаляр – асоба, якая вучылася ў сярэдневяковым універсітэце;<br>сінонімы: вучань, школьнік, студэнт | 2 | 1 | 1- za wyjaśnienie terminu,<br>1 - za podanie synonimu |
| 5. | - сапраўды займацца навукай;<br>- рыхтавацца да заняткаў, чытаць кнігі;<br>- назапашваць веды;<br>- не марнаваць часу на розныя гульні | 1 | 0 | |
| 6. | Прыклады бесклапотнага жыцця: ёсць студэнты, якія не ходзяць на заняткі, іграюць у карты, шахматы.<br>Цяжкасці жыцця: бедныя студэнты ходзяць жабраваць, перапісваюць лекцыі багацейшым, ушываюць гузікі.<br>- Кантраст у жыцці студэнтаў з розных сацыяльных саслоўяў. | 2 | 1 | 1 – za podanie tylko przykładów życia beztroskiego lub trudów życia, 2- za wskazanie plusów i minusów |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 7. | Дыспуты   дыскусія, у якой прымалі ўдзел выкладчыкі і студэнты<br>- адна з форм засвойвання заняткаў;<br>- заняткі, на якіх студэнты вучыліся, як умела аргументаваць і аспрэчваць, пераканаўча даводзіць, чыя думка правільная, а чыя памылковая. | 2 | 1 | 1 pkt – za ogólne wytłumaczenie terminu<br>2 pkt – za odniesienia do tekstu (np. opis form zaliczenia zajęć) |
| 8. | - Скарыну мог запрасіць у Прагу кароль Сігізмунд I на пасаду сакратара;<br>- з Прагі зручна было наладзіць кантакты з цэнтрамі еўрапейскага кнігадруку;<br>- у Празе друкаваліся ўжо  кнігі на роднай мове чэхаў;<br>- у Празе пачынаюць працаваць першыя папяровыя млыны, можна было дастаць танную паперу, неабходную для друкавання кніг. | 2 | 1 | 1- za podanie 1 przyczyny<br>2 – za podanie więcej niż 1 |
| 9. | Дзеяслоў “ратаваць” ужыты ў пераносным значэнні, метафарычнае значэнне слова. Даслоўнае значэнне дзеяслова – даваць ратунак, дапамогу; ратаваць каго-небудзь, ці што-н. у цяжкім выпадку. Метафарычнае значэнне дзеяслова “ратаваць” (душу): клапаціцца аб збаўленне, выратаванне душы; зберагчы душу ад вечнага асуджэння пасля смерці. | 2 | 0 | punkty przyznajemy za informację, że wyraz został użyty w przenośnym znaczeniu; polecenie nie wymaga interpretacji tego znaczenia |
| 10. | -Скарына выдае і перакладае кнігі дзеля таго, каб вучыць простых людзей;<br>- Скарынавы кнігі падаюць інфармацыю з розных галін ведаў ( з паасобных Скарынавых кніг чытач можа вучыцца арыфметыцы, землямер'ю, астраноміі і г.д.) | 1 | 0 | |
| 11. | - у 9 і 11 абзацах падаецца інфармацыя адносна кніг, якія Скарына выдаў у Празе і ў Вільні. | 1 | 0 | |
| 12. | - Скарына выдае кнігі, каб навучыць небагатых людзей чытаць і пісаць;<br>- Скарынавы кнігі з’яўляюцца энцыклапедыяй ведаў з розных галін;<br>- “Малая падарожная кніжыца” разлічана на купцоў і рамеснікаў;<br>- друкаванне біблейскіх кніг для простых людзей на іх мове (беларускай) было змаганнем за роўнасць, за павагу да роднай мовы. | 2 | 1 | 1 pkt za podanie jednego argumentu |
| 13. | б) | 1 | 0 | |
| | **Suma punktów** | **21** | | |

**Część II – pisanie własnego tekstu**

**Temat 1:**
**Na podstawie kreacji bohaterów „Obławy” Wasila Bykowa rozważ problem winy w dobie kolektywizacji.**

| Kryteria | | | Punktacja 22 |
|---|---|---|---|
| **1. Rozwinięcie tematu** | 1. | Umiejętność określenia istoty kolektywizacji i jej mechanizmów, np. kolektywizacja jako socjalistyczna forma przebudowy rolnictwa: łączenie indywidualnych gospodarstw rolnych w spółdzielcze przedsiębiorstwa rolne, likwidacja rolniczej własności prywatnej, itp. | 0–2 |
| | 2. | Charakterystyka różnych postaw wobec systemu: np.:<br>- Mikoła Rouba- np. bezgranicznie oddany systemowi,<br>- Chwiedar Rouba- np. obojętny wobec systemu lub nie rozumiejący go<br>- żona Chwiedara- np. odcinająca się od systemu,<br>- Szurka- np. oddany systemowi, ale wyżej ceniący więzy rodzinne,<br>- Iwan Sokur- np. konformista, itp. | 0-6 po 2 pkt za charakte-rystykę bohatera |
| | 3. | Problem winy:<br>- w odniesieniu do „kułaka”: interpretacja określenia „kułak” w wymiarze historyczno-politycznym (bogaty gospodarz, swym życiem przeczący ideom kolektywu, wyzyskujący biedniejszych, itp.) – **2pkt**<br>- praktycznym – (kułakiem mógł zostać nazwany niemal każdy: na przykładzie Chwiedara Rouby – którego jedyną winą było posłuchanie syna i chęć polepszenia poziomu życia ludzi we wsi) – **2pkt**<br>- w odniesieniu do nieświadomych ofiar: dzieci (Oleńka, pozbawiona nowych walonków), starców (Chwiedara, który tęsknił za domem) – **2pkt**<br>- w odniesieniu do zwolenników systemu, niesłusznie przezeń odrzuconych (na przykładzie Szurki, który stał się ofiarą własnej aktywności) – **2pkt**<br>- w odniesieniu do przedstawicieli systemu (Mikoła, który wyrzekł się ojca, samemu będąc odpowiedzialnym za jego „bogactwo” i / lub doprowadził do wykluczenia z partii swego najlepszego przyjaciela, chociaż robili dokładnie to samo)- **2pkt** | 0–10 |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | 4. | Przedstawienie wniosków:<br>- pełne – określenie problemu winy w dobie kolektywizacji jako konsekwencji wprowadzonego systemu socjalistycznego. Ocena problemu winy z współczesnego punktu widzenia: winni byli zwolennicy systemu, niewinni – jego ofiary i przeciwnicy.<br>- częściowe – stwierdzenie, iż w przytoczonych fragmentach autor przeciwstawiał sobie dwie postawy ludzkie: zwolenników systemu i ich ofiary. Winą obarczył tych pierwszych, stwórców fikcyjnego wroga.<br>- próba podsumowania – krótkie przypomnienie opisanych wcześniej treści | 4<br><br><br><br><br>(2)<br><br><br><br>(1) |
| **Kryteria oceny języka i kompozycji** | | | **27** |
| **2. Składnia i fleksja** | Poprawna i nieschematyczna składnia i poprawna fleksja. | | **9** |
| | Poprawna składnia i fleksja. | | 7 |
| | Na ogół poprawna składnia i fleksja. | | 5 |
| | Mimo błędów składnia i fleksja nie zakłócająca komunikatywności języka. | | 3 |
| **3. Słownictwo, frazeologia, styl** | Bogate i zróżnicowane słownictwo i poprawna frazeologia, swobodny i żywy styl. | | **10** |
| | Na ogół wystarczające słownictwo, poprawna frazeologia, komunikatywny styl. | | 7 |
| | Na ogół poprawne słownictwo i na ogół komunikatywny styl | | 4 |
| **4.Ortografia, interpunkcja** | Na ogół bezbłędna ortografia. | | **4** |
| | Sporadyczne błędy ortograficzne różnego stopnia. | | 2 |
| | Błędy ortograficzne z przewagą drugorzędnych i interpunkcyjne. | | 1 |
| **5. Kompozycja** | Funkcjonalna wobec tematu, spójna, logiczna. | | **4** |
| | Trójdzielna, spójna, graficzne wyodrębnienie głównych części. | | 2 |
| | Wskazująca na próby porządkowania myśli, na ogół spójna. | | 1 |

**Temat 2:**
**W jaki sposób Maksim Bagdanowicz ukazuje relacje między zjawiskami przyrody i emocjonalnym światem bohaterów w wierszach „Zimą” („Zimoj”) i „Romans” („Ramans”)?**

| Kryteria | | | **Punktacja 22** |
|---|---|---|---|
| **1. Rozwinięcie tematu** | 1. | Opis przedstawionych sytuacji lirycznych, tzn.<br>- rozłąka zakochanych w wierszu „Ramans”, obserwacja wieczornego nieba<br>- samotny wieczorny spacer bohatera lirycznego w wierszu „Zimoj”, obserwacja zimowego pejzażu | 0-2 |
| | 2. | Opis stanu emocjonalnego podmiotu lirycznego w obu wierszach:<br>- miłość, żal związany z rozstaniem, tęsknota w wierszu „Ramans” – **2 pkt**<br>- spokój i wyciszenie i / lub zachwyt, ekscytacja- w końcowej części utworu, wynikające z obserwacji przyrody w wierszu „Zimoj” - **2 pkt** | 0-4 |
| | 3. | Odniesienie przedstawionych w wierszach zjawisk przyrody do emocji podmiotu lirycznego, np.:<br>- wschodząca gwiazda w wierszu „Ramans” jako symbol miłości i tęsknoty,<br>- wieczorny spokój w wierszu „Zimoj” jako odbicie wewnętrznej radości podmiotu lirycznego)<br>- zwrócenie uwagi na stylistykę, wykorzystaną do ukazania tychże powiązań (dynamizm opisów w wierszu „Zimoj” i statyczność w „Ramansie” itp.) | 0-3 |
| | 4. | Zwrócenie uwagi na współodczuwanie człowieka i przyrody, przejawiające się także na poziomie stylistycznym (np. jako personifikacja zjawisk przyrody)<br>*Za użycie terminu personifikacja – **1 pkt*** | 0–3 |
| | 5. | Określenie funkcji natury w wierszach, np.<br>- gwiazda Wenus jako pośrednik między kochankami, zjawisko umożliwiające im „ponowne połączenie”, łagodzące tęsknotę bohatera, itp.; pretekst do ukazania uczuć, łączących parę kochanków, umożliwiający wprowadzenie do utworu motywu miłości<br>- pejzaż zimowy jako przyrodnicza ilustracja wewnętrznego stanu podmiotu lirycznego lub natura rozumiejąca stan bohatera. | 0–4 |
| | 6. | Zwrócenie uwagi na „jedność duszy z przyrodą” w obu wierszach (współodczuwanie, podkreślanie stanów wewnętrznych, łagodzenie wewnętrznych napięć itp.) | 0-2 |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | 7. | Przedstawienie wniosków:<br>- pełne – podkreślenie powiązań między człowiekiem i przyrodą w obu wierszach oraz podkreślenie różnic między kreacjami przyrody<br>- częściowe<br>- próba podsumowania | 4<br><br><br>(2)<br>(1) |
| **Kryteria oceny języka i kompozycji** | | | **27** |
| **2. Składnia i fleksja** | Poprawna i nieschematyczna składnia i poprawna fleksja. | | **9** |
| | Poprawna składnia i fleksja. | | 7 |
| | Na ogół poprawna składnia i fleksja. | | 5 |
| | Mimo błędów składnia i fleksja nie zakłócająca komunikatywności języka. | | 3 |
| **3. Słownictwo, frazeologia, styl** | Bogate i zróżnicowane słownictwo i poprawna frazeologia, swobodny i żywy styl. | | **10** |
| | Na ogół wystarczające słownictwo, poprawna frazeologia, komunikatywny styl. | | 7 |
| | Na ogół poprawne słownictwo i na ogół komunikatywny styl | | 4 |
| **4.Ortografia, interpunkcja** | Na ogół bezbłędna ortografia. | | **4** |
| | Sporadyczne błędy ortograficzne różnego stopnia. | | 2 |
| | Błędy ortograficzne z przewagą drugorzędnych i interpunkcyjne. | | 1 |
| **5. Kompozycja** | Funkcjonalna wobec tematu, spójna, logiczna. | | **4** |
| | Trójdzielna, spójna, graficzne wyodrębnienie głównych części. | | 2 |
| | Wskazująca na próby porządkowania myśli, na ogół spójna. | | 1 |

Miejsce
na naklejkę
z kodem szkoły

*dysleksja*

# EGZAMIN MATURALNY Z JĘZYKA BIAŁORUSKIEGO

## POZIOM ROZSZERZONY

**Czas pracy 180 minut**

**Instrukcja dla zdającego**

1. Sprawdź, czy arkusz egzaminacyjny zawiera 16 stron. Ewentualny brak zgłoś przewodniczącemu zespołu nadzorującego egzamin.
2. Pisz czytelnie. Używaj długopisu/pióra tylko z czarnym tuszem/atramentem.
3. Nie używaj korektora, a błędne zapisy wyraźnie przekreśl.
4. Pamiętaj, że zapisy w brudnopisie nie podlegają ocenie.
5. Możesz korzystać ze słowników językowych.
6. Wypełnij tę część karty odpowiedzi, którą koduje zdający. Nie wpisuj żadnych znaków w części przeznaczonej dla egzaminatora.
7. Na karcie odpowiedzi wpisz swoją datę urodzenia i PESEL. Zamaluj ■ pola odpowiadające cyfrom numeru PESEL. Błędne zaznaczenie otocz kółkiem ◙ i zaznacz właściwe.

***Życzymy powodzenia!***

Za rozwiązanie wszystkich zadań można otrzymać łącznie **60 punktów**

*Część I – 15 pkt*
*Część II – 45 pkt*

**Wypełnia zdający przed rozpoczęciem pracy**

**PESEL ZDAJĄCEGO**

**KOD ZDAJĄCEGO**

# CZĘŚĆ I – ROZUMIENIE CZYTANEGO TEKSTU

**Прачытай уважліва фрагменты размовы двух вядомых беларускіх пісьменнікаў маладога пакалення- Юрася Барысевіча і Алгерда Бахарэвіча і адкажы на пытанні. Пішы коратка, згодна з патрабаваннямі.**

Юрась Барысевіч, ***Іголка прозы.*** **[...]**

1. **Ю.Б.** *Чаму ты пачаў занатоўваць свае думкі? І ці можна падзяліць ідэі, як грошы, на свае і агульныя, нічыйныя і чужыя?*
   **А.Б.** Латышская паэтка Ё падчас свайго прыезду ў Беларусь на пытаньне пра крыніцы творчасьці адказала: «Мастацтва пачынаецца з перайманьня». Недзе ў нябёсных архівах, якія нам аніколі не рассакрэціць, можа, і захоўваюцца ноў-хаў[1] мноства прыватных натхненьняў – аднак для большасьці з нас, я мяркую, уласная літаратурная дзейнасьць пачынаецца з жаданьня «напісаць гэтак жа файна, як піша…». Досыць простая схема: чалавек чытае, яму падабаецца, ён рэфлексуе і пачынае пісаць сам. Каб пачаць ствараць мастацкія тэксты, трэба палка палюбіць літаратуру, а каб пачаць ствараць арыгінальныя мастацкія тэксты, трэба літаратуру трошачкі ўзьненавідзець.[…]

2. Сваю найпершую кніжку я выдаў, калі мне было гадоў дзесяць. Магчымасьцяў прыватнага выдавецтва, якое зьмяшчалася ў куце дзіцячага пакою, хапіла на два асобнікі. […] Памятаю, што пісаў прозу… Праз некалькі гадоў, у больш сьвядомым узросьце, я пачаў пісаць ужо цалкам літаратурападобныя творы. […] Калі мне было шаснаццаць, мовай маіх опусаў канчаткова стала беларуская. […] Дарэчы, ужо тады я асьцерагаўся блытаць літаратуру з журналістыкай, і выдумляць мне падавалася больш творчым заняткам, чым апісваць рэальны сьвет і рэальныя падзеі. Такога ж перакананьня прытрымліваюся й цяпер. Запіхваць цагліны ўласнага жыцьця ў іголкавае вушка прозы (а менавіта такой яна, проза, мусіць быць) – занятак для літаратурных падмайстраў.На сёньня я аўтар трох кніг прозы.
   […]

3. **Ю.Б.** *На думку Ільлі Сіна, “беларускія масы” — гэта міф, ілюзія, і таму масавая (папулярная) літаратура на беларускай мове наогул немагчымая. Ці ўсё ж нейкая надзея ў гэтым плане ёсьць? […]*
   **А.Б.** Думаю, што масавая (папулярная) літаратура на беларускай мове, як і на любой іншай, – ня проста немагчымая, але й непатрэбная. Верагодна, у кожнай краіне існуе даволі вузкае кола людзей, якія цікавяцца сур’ёзнай літаратурай (літаратурай, а ня модай на яе), і гэта нармальна. Посьпех уласных кнігаў мусіць насьцярожыць добрага пісьменьніка. Малая колькасьць адданых чытачоў – ідэальны варыянт: можна, прынамсі, быць упэўненым, што твае кнігі – не тупыя. Горш, калі цябе зусім не чытаюць.Пісьменьніку трэба роўна столькі чытачоў, колькі можа пракарміць яго і ягоную сям’ю.На маю думку, пісьменьніка мусіць цікавіць толькі ён сам. Толькі тады ім зацікавяцца чытачы. […]

[1] ноў-хаў (анг. know-how)- практычныя здольнасці, тут: інфармацыі аб здольнасцях

4. **Ю.Б.** *Аднойчы ты сказаў, што быць пісьменьнікам небясьпечна, бо даводзіцца браць на сябе чужую пакуту. Аднак балюча ты робіш ня толькі сабе. Ці маем мы права катаваць тых, хто даверліва купляе або прымае ў падарунак нашыя тэксты?*
   **А.Б.** Упэўнены, што мастацтва нараджаецца з болю. Я ня бачыў ніводнага добрага мастацкага твору, які нарадзіўся дзякуючы прыемнаму адчуваньню. Мастацтва, на мой погляд, ёсьць хваробай – зрэшты, вылечнай. У “Натуральнай афарбоўцы” я паспрабаваў паказаць грамадства, якое настолькі прызвычаілася да болю, што людзі нават у пашпартах маюць адмысловую старонку “Хваробы й калецтвы” […]. Усе персанажы кнігі – хворыя. Боль, як вядома, – папярэджаньне ад арганізму, сігнал небясьпекі. Мне здаецца, для мастацтва боль – універсальны вобраз нашых дачыненьняў з навакольным сьветам.[…]

5. **Ю.Б.** *Корпацца ў самім сабе, аналізаваць свае асабістыя памылкі й мары, каб потым цікава распавесьці пра іх незнаёмым (і, што яшчэ цяжэй, блізкім) людзям мала хто здольны. Прасьцей і бясьпечней пісаць не пра чалавека, а пра народ, не пра сябе, а пра вядомых палітыкаў. […]*

6. **А.Б.** На жаль, у сучаснай літаратуры працуе толькі жменька аўтараў, здольных ствараць Мастацтва. Абсалютная большасьць айчынных літаратараў, у лепшым выпадку, – нядрэнныя журналісты. Бо іх таленту хапае хіба на добрасумленнае апісаньне падзеяў і (ці) загрыміраванае пад літаратуру выкладаньне ідэяў, пераважна не сваіх. Але журналістыка ўсё ж належыць да сферы абслугоўваньня, а літаратура, як бы яе ні катавалі графаманы, – да мастацтва. Мала каго з беларускіх пісьменьнікаў цікавіць літаратура, а не ідэалогія – іх творы, дый паводзіны, яскрава сьведчаць на карысьць гэтай непрыемнай высновы.

7. Расшпілім на нашай крывадушнасьці хаця б адзін гузік: шмат хто з “майстроў” прыгожага пісьменства краіны на цяперашні момант занятыя надзвычай важнымі справамі – узаемнай грызьнёй, манапалізацыяй права прэзентаваць бел. літ. за мяжой, запаўненьнем нішаў, пераасэнсаваньнем савецкай спадчыны […]. Між тым, пісьменьнік, паводле вызначэньня, мусіць **пісаць**. Дарэчы, наконт запаўненьня нішаў. Гэтая тэма з пэўнага часу стала нумарам першым у разнастайных калялітаратурных дыскусіях. Як высьвятляецца, Беларусі патрэбныя свая Марыніна, свой Пялевін, свой Усьпенскі і мноства іншых франкенштайнаў, змайстраваных на аснове тутэйшага генетычнага матэрыялу. Бяда ўсёй гэтай квазілітаратурнай грамады – у змушаным, але празьмерным заклапочаньні краінай, калі клапаціцца трэба пра сябе: бяз досьледу сваёй асобы мастаком ня станеш.[…]

8. Чаму беларуская літаратура за ўвесь час свайго існаваньня так і ня здолела ўзгадаваць аніводнае сусьветнае знакамітасьці? Чаму яна ня здолела спарадзіць таго пісьменьніка, чыя творчасьць была б у стане пераркуліць сьвядомасьць ня толькі беларуса, але й зімбабвійца, венесуэльца, японца, ня кажучы ўжо пра ангельца або француза? Бо ў цягніку гэтай літаратуры ніколі не было пісьменьнікаў-чараўнікоў.
   Чараўнік у дадзеным выпадку – зусім ня той, хто займаецца ў сваіх творах […] эксплуатацыяй міфалагічных істотаў, няшчасных насельнікаў уласнага канцлагеру аўтара; і пагатоў ня той, хто піша казкі або, барані божа, працуе на

такі жанр, як фантастыка. Рэч у тым, што сапраўдны чытач – чулы, уважлівы, тонкі! – чакае ад літаратуры не інфармацыі, не забавы й не нагоды для разважаньняў на актульныя тэмы. Усё пералічанае чалавеку можа даць газета, тэлевізія ці іхні ўдачлівы канкурэнт – Інтэрнэт. Чытач чакае ад мастацкай кнігі, каб тая завязала яму вочы, узяла за ганарлівую руку й завяла ў таямнічы лес – завяла й кінула там. Чакае чараўніцтва.Кожнае чараўніцтва, па-сутнасьці, ёсьць вялікім падманам. Такім чынам, сапраўдны чытач падсьвядома чакае, каб яго падманулі, ды так, каб ён ня мог уцяміць, як жа зьдзейсьніўся той падман. […]

**9.** Тэксты трэба адчуваць не галавой і ня сэрцам, а хрыбтом. Менавіта халадок у чытацкім хрыбце мусіць быць асноўным крытэрыем мастацкай вартасьці твора. Гэтая думка належыць аднаму з найбліскучых літаратараў XX стагоддзя Уладзіміру Набокаву. Галаву ды сэрца здольныя задаволіць першая паласа газеты, п’яная размова з сябрам або Вялікая Савецкая Энцыклапедыя. А “для таго, каб твор мастацтва быў бесьсьмяротным, неабходна, каб ён выйшаў за межы чалавечага – туды, дзе адсутнічаюць здаровы сэнс і логіка” (Джорджэ Дэ Кірыко).

Тэкст падаецца згодна з правапісам «тарашкевіцы».

Юрась Барысевіч *Іголка прозы. Ліставаньне з Альгердам Бахарэвічам [w:]* „Дзеяслоў” nr 13, http://www.dziejaslou.by/inter/dzeja/dzeja.nsf/htmlpage/bar13?OpenDocument

## Заданні да тэксту

### Заданне 1. *(1 пункт)*
**Загаловак тэксту ”Іголка прозы” адносіцца да**
а) творчых метадаў.
б) апавядання Алгерда Бахарэвіча.
в) літаратурнай крытыкі.

### Заданне 2. *(2 пункты)*
**З чаго выводзіцца ”перайманьне”, аб якім А. Бахарэвіч піша ў 1 абзацы?**

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

### Заданне 3. *(2 пункты)*
**Якой колькасці чытачоў павінен жадаць пісьменнік і чаму? Адкажы на аснове 3 абзаца.**

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

### Заданне 4. *(2 пункты)*
**У 4 абзацы Алгерд Бахарэвіч ужывае словазлучэнне ”персанажы кнігі”.**
а) Растлумач сваімі словамі яго значэнне.
б) Падбяры два сінонімы да слова ”персанажы”.

а)......................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

б)......................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

### Заданне 5. *(2 пункты)*
**Чым, паводле Алгерда Бахарэвіча, адрозніваюцца літаратура і мастацтва? Адкажы на аснове 2 і 6 абзацаў.**

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

**Заданне 6.** ***(1 пункт)***
**У 7 абзацы Алгерд Бахарэвіч піша пра ”франкенштайнаў літаратуры”. Што ён закідае творцам такога віду?**

.....................................................................................................................................

.....................................................................................................................................

.....................................................................................................................................

**Заданне 7.** ***(1 пункт)***
**У 8 абзацы Алгерд Бахарэвіч піша пра недахоп пісьменнікаў- чараўнікоў у беларускай літаратуры. Што выклікае гэты недахоп?**

.....................................................................................................................................

.....................................................................................................................................

.....................................................................................................................................

**Заданне 8.** ***(1 пункт)***
**Алгерд Бахарэвіч піша ў 8 і 9 абзацах пра галоўных канкурэнтаў мастацкай літаратуры- пра газету, тэлебачанне і Інтэрнэт. Што, паводле пісьменніка, яны даюць чалавеку?**

.....................................................................................................................................

.....................................................................................................................................

.....................................................................................................................................

**Заданне 9.** ***(2 пункты)***
**а) Знайдзі ў 2 і 7 абзацах прыметнікі, утвораныя ад слова *літаратура* (3).**
**б) Гэтыя прыметнікі з’яўляюцца сінонімамі. Выясні іх значэнне.**

а)...................................................................................................................................

.....................................................................................................................................

б)...................................................................................................................................

.....................................................................................................................................

**Заданне 10.** ***(1 пункт)***
**Размова між літаратамі датычыць**
а) паасобных беларускіх пісьменнікаў.
б) мэтаў і становішча беларускай літаратуры.
в) палітычнай сітуацыі ў дзяржаве.

# CZĘŚĆ II – PISANIE WŁASNEGO TEKSTU

**Ta część zawiera dwa tematy sprawdzające umiejętność pisania własnego tekstu w związku z tekstem literackim zamieszczonym w arkuszu. Wybierz jeden z nich i napisz wypracowanie. Wybrany temat podkreśl.**

**Тэма 1:**
**Прааналізуй фрагменты апавядання Яна Баршчэўскага *Белая сарока*, звярні ўвагу на спосаб паказання зла ў творы.**

Ян Баршчэўскі, ***Белая Сарока***
(Апавяданне восьмае – скарочана)

Вы, панове, ведаеце акружанае цёмным лесам возера Язна, дзе мяжуюць тры паветы: Полацкі, Себежскі і Невельскі. Недалёка ад таго возера быў вялікі маёнтак, жыў у ім пан, якога і цяпер, успамінаючы, называюць Скамарохам, і ён меў падданых у тых трох паветах.

Дык вось той пан Скамароха быў надзвычай неспакойнага нораву, фанабэрлівы і хцівы, да суседзяў ездзіў толькі з прэтэнзіямі, меў грошы і заўсёды судзіўся, крыўдзіў бедных, удоў і сірот. Яго падданыя мелі пекла на гэтым свеце.

Рэдка хто наведваў яго дом. Пры ім неадступна быў вялізны чорны сабака. Слугі заходзілі ў пакой толькі тады, калі ён свістам даваў знаць, што нехта з іх патрэбен.

Скамароха быў адзін у пакоі.[...]

Між тым, калі ён перабіраў у думках розныя спосабы, як павялічыць свае ўладанні, на зямлю апусціўся вечар і шэры змрок. Нечакана над яго жытлом павіслі хмары, зашумеў за сцяною вецер і лінуў дождж. У пакоі цёмна, толькі цьмяна свяціліся шыбы.

Ледзь Скамароха ачнуўся ад думак, як бліскавіца асвяціла пакой і ён убачыў, што нейкая дзіўная і страшная постаць стаіць у кутку ля дзвярэй. Ён спалохана закрычаў, стаў клікаць да сябе лёкаяў, але грымоты і шум ветру глушылі крык, ніхто не пачуў пана і не прыбег.

Высокая, худая постаць падышла да яго.

– Не крычы, – сказала яна. – Ніхто не пачуе твой голас, і твой чорны сабака моцна спіць.

– Хто ты і як сюды трапіў?

– Пачакай крыху і пра ўсё даведаешся, – кажучы гэта, прывід выкрасаў агонь і запаліў свечку, якая стаяла на стале перад люстэркам.

Пры святле Скамароха ўбачыў дзіўнае стварэнне: чалавека на танюсенькіх нагах, худы, вочы круглыя, дробным і вострым тварам падобны да птушкі. Закрычаў пан дрыготкім голасам: Які жахлівы твар! Відаць, перада мною злы дух.

– Не крычы, я падобны да цябе і магу табе шмат добрага зрабіць.

– Чаго ты сюды прыйшоў, ды так ціха, што і сабака не ўчуў? [...]

– Сядзь у сваё крэсла, супакойся, і ўсё раскажу табе. Я днём адпачываю, а пасля заходу сонца блукаю па свеце і выведваю, пра што людзі думаюць, пра што гавораць, што ядуць і п'юць. Ведаю сакрэт, як наслаць моцны сон на сабак і варту; слухаю, пра што гаворыць прасталюдзін і выведваю думкі паноў; маё вока хуткае, а слых такі тонкі, што за сцяною (няхай гэта будуць найтаўсцейшыя муры) магу чуць шэпт; па рысах твару характары людзей, змушаю іх гаварыць паміж сабою і памятаю пра ўсё; заходжу праз маленькую шчылінку, і дзверы не скрыпяць, калі я іх адчыняю.[...]

– Я – пасланец Белай Сарокі, даведаўся пра твае памысныя думкі і прывабныя намеры.

– І хто ж тая Белая Сарока, якую ты ўспомніў?

– О! Белая Сарока мудрасцю свет здзіўляе, яе твар – цуд прыгажосці, постаць высокая, велічная; адзенне з дарагіх дыяментаў і перлаў, жыве ў палацы, якога ты яшчэ ніколі не бачыў, ёй кланяюцца багатыя паны і мудрыя галовы, духі па яе загадзе здабываюць скарбы з зямлі і мора, дзікіх мядзведзяў прывучыла да сябе, і тыя, як пакорлівыя сабакі, заўсёды гатовыя ёй служыць. Словам, яна мацнейшая за ўсіх чарнакніжнікаў. Толькі часам убіраецца ў пёры белае птушкі, калі хоча бачыць тых, хто спрыяе ёй: і іх узнагароджвае, узбагачае, робіць шчаслівымі.

Бледны Скамароха, гледзячы на пасланца, вымавіў:

– Дзіўныя і незразумелыя рэчы мне гаворыш.

– Заўтра гэтай парою я буду ў цябе, і Белая Сарока прыляціць у твой дом адпачыць. Пастарайся прыняць яе добра і будзь у размове абачлівы; апоўначы лёкаі няхай не заходзяць у твой пакой, няхай першы візіт гэтае пані будзе таемны. [...] Толькі сказаў гэта – залятае ў вакно сарока, большая і зграбнейшая за іншых сарок, пёры не ёй белыя, як снег, вочы чорныя. Апусцілася на стол. Здзіўлены гаспадар паглядае на жвавыя і імклівыя рухі прыгожае птушкі. Зляцела на падлогу – і ў міг вока стаіць пасярод пакоя кабета чароўнае красы: рост высокі, твар ружовы, вочы вялікія, поўныя прывабнасці, на галаве і на ўсім адзенні зіхацяць дыяменты і каштоўныя камяні. Скамароха аслупянеў, слова вымавіць не асмельваецца. Яна ж такімі словамі перапыніла маўчанне:

– Калі ляцела, дык бачыла прыгожыя горы і лясы гэтае краіны, тут вельмі шмат азёр. Думаю, жыхарам нічога не бракуе?

– Так, пані, – сказаў з паклонам ціхім голасам гаспадар. – Нашыя мясціны прырода адарыла ўсім, што толькі трэба чалавеку.

– Я даўно мелася пабываць тут, спазнаць гэты край і яго жыхароў. Спадзяюся, што знайду тут сабе зычлівых прыяцеляў.

– Шмат хто будзе мець за шчасце ўбачыць пані.

– А як маюцца тутэйшыя падданыя?

– І яны шчаслівыя. На лугах даволі травы для вялікіх чародаў.

Белая Сарока села на крэсла, а пан Скамароха – ля яе. Доўга апавядаў ёй пра берагі Дрысы і Дзвіны. Расказваў, хто ў ваколіцах як жыве, якую славу мае сярод суседзяў, якія даходы з фальваркаў. Расказваў, як гандлююць з Рыгаю, калі разальюцца вясною рэкі, і якая выгада ад таго жыхарам гэтага краю. Размова без перапынку цягнулася да поўначы.

– Я яшчэ наведаю гэты край. І ты пазнаёміш мяне са сваімі добрымі суседзямі. [...]

У хуткім часе пачалі спраўджацца прадчуванні простых людзей. Тая страшная чараўніца патаемна разаслала ва ўсе бакі шкоднікаў, каб яны крыўдзілі бедных сялян. [...] Дойныя каровы, усе адразу, пачалі сохнуць, і малако ў іх зусім прапала. Бясспрэчна, чары. Па ўсіх ваколіцах былі чуваць скаргі і нараканні, ды не можна было ўведаць, адкуль прыйшло тое зло. Выпадкам адзін вартаўнік з Клішкова, перад самым узыходам сонца вяртаўшыся дадому, убачыў, што сарока, белая, як снег, вылецела з хаты аднае кабеты, якой пан у той вёсцы пабудаваў новую хату з велізарнымі вокнамі. Вартаўнік расказаў гэта іншым. Сталі падазраваць. [...] Нарэшце пра ўсё даведаліся дзіўным чынам. Калі чараўніца на Купалле, схаваўшыся ў дзікім лесе, брала ў прыгаршчы расу і заклікала злых духаў, каб яны, збіраючы з усіх ваколіц малако, напаўнялі яе посуд, а нанятая за колькі дзён перад тым пахолка[1], не ведаючы пра

---

[1] пахолка – służąca

намеры свае гаспадыні, павымывала ўсе гліняныя збанкі і драўлянае начынне, перакуліўшы, паставіла сушыць. Злыя духі, не ўбачылі гэтага, цэлую ноч насілі малако, вылівалі на падлогу, і раніцаю ўся вёска ўбачыла, што з-пад чараўніцынай хаты плыве глыбокая малочная рака. Не мінула б чараўніцу смерць, ды, калі даведалася пра ўсё, імгненна ператварылася ў птушку і адляцела недзе далёка.

Тады было шмат заломаў у жыце, з'явіліся такія порсткія[1] звяркі, што забіць іх было немагчыма, і яны па аборах стрыглі авечак, а мядзведзі, нападаючы ўсюды на пчальнікі, збіралі мёд. [...] Нешчаслівы быў час, наракалі на гора сваё людзі, раздзірала сэрца выццё ваўкалакаў.

– Што ж потым здарылася з панам Скамарохам і іншымі прыхільнікамі Белае Сарокі?

– Белая Сарока, чуючы людскія праклёны і даведаўшыся ад д'яблаў, што стральцы з набітымі стрэльбамі сочаць за ёю, адляцела далёка і больш не з'яўлялася ў нашым краі. Але зло, якое яна пакінула, распаўзлося па наваколлі. Тыя, што пілі віно за яе здароўе, п'юць слёзы няшчаснага люду. Пан Скамароха выехаў з гэтае мясцовасці, і кажуць, быццам ён у палацы Белае Сарокі ў абліччы страшнага мядзведзя вартаваў яе незлічоныя скарбы.[...]

Я. Баршчэўскі, *Выбраныя творы, Укладанне, прадмова і каментарыі Міколы Хаўстовіча,* Мінск 1998, стар. 205, 206, 207, 209-210, 212, 213 і 214.

[1] порсткі – szybki, zwinny

**Тэма 2:**
**Параўнай спосаб прадстаўлення матыву разлукі з радзімай і вяртання дадому у вершах Уладзіслава Сыракомлі *Бусел* і Янкі Купалы *У вырай.***

Уладзіслаў Сыракомля, ***Бусел***

Зімка надходзіць, звіслі туманы,
І вецер круціць і свішча.
На небе – цёмных хмар караваны.
Бусел узняўся і задуманы
Паплыў павольна на ржышча.
Сеў і клякоча, падняўшы ногу,
Дый жмурыць цёмнае вока.
Пэўне, ён думку ўздумаў глыбока,
Ужо выбірацца ў дарогу.

«Добра на вырай ляцець цяплейшы,
Пабачыць дзівы ў чужбіне,
Сонца над Нілам агонь яснейшы,
І думаць думку пра край тутэйшы
На піраміды вяршыне.
А толькі... толькі ведама Богу,
Ці смерць ў дарозе абміну!
Пабачу ж Нёман і азярыну?!
Сяду ж на купцы мурогу?!

Я ж тут радзіўся, дзе гэта хатка,
Шчасця знаў дзянькі нярэдкі:
Ось тут, дзе выган і сенажатка,
Бывала, косіць касцоў грамадка,
Клякочуць жонка і дзеткі.
Добра ж тут была!.. Цяпер не знаю,
Ці не заплачу па згубе!
Ці, прыляцеўшы вясной з выраю,
Гняздо застану на дубе!

Рад бы застаўся ў гэтай старонцы,
Дзе страх не страшыць, ні гора,
А толькі болей не грэе сонца,
Дый няма корму дзеткам ні жонцы,
Снег тут пасыпле ускора».
Так пажурыўшысь думкаю шчырай,
Бусел, узняўся паволі,
Паплыў па небе кудысь на вырай
Шукаць і шчасця і долі.

Пераклад Янкі Лучыны

*Раса нябёсаў на зямлі тутэйшай, Беларуская польскамоўная паэзія XIX стагоддзя, Укладанне, прамова і каментарыі Уладзіміра Мархеля,* Мінск 1998, стар. 471-473.

Янка Купала**, *У вырай***

Зашумела нудна восень

Шумам  лісцяў, шумам сосен,

Даўшы волю хмурам;
Ажно з гоняў Беларусі
Ў вырай выляцелі гусі,
Паплылі ўдаль шнурам.

Следам з выраем, з гусямі
Паляцелі думкі самі,
Сэрца ўскалыхнулі;
Ўскалыхнулі долі плесняй,
Азваліся казкай-песняй,
Ў смутку патанулі...

Ой, вам, гусі-вырайніцы,
Жыць нядоўга ў чужаніцы,
Зноў к нам прыплывеце,
Зноў вас будуць сустракаці
Нашы рэчкі, сенажаці,
Наша сонца ў цвеце.

Ой, вы, гусі-гудзіцелькі,
Не забудзеце зямелькі,
Дзе дзяцей пладзілі,
Дзе вы месячык страчалі,
Дзе вы зоркі падлічалі,
Плавалі, хадзілі.

Знаю, зложыце тут косці,
Толькі злётаеце ў госці
Асвяжыці грудзі:
Вы не ўмееце йшчэ, гусі,
Выракацца Беларусі,
Як умеюць людзі.

Я. Купала*, Выйдзі з сэрцам, як з паходняй!.. Выбранае,* Мінск 1982, стар. 150-151.

# OCENIANIE
# POZIOM ROZSZERZONY

**Część I – rozumienie tekstu**

| Nr. zad | Odpowiedzi | Maks. liczba pkt 15 | Pkt cząstko-we. | Uwagi |
|---|---|---|---|---|
| 1. | а | 1 | | |
| 2. | Ягонай крыніцай з'яўляецца любоў да літаратуры і з жадання пісаць так, як любімы аўтар | 2 | 1 | 1- za podanie jednego argumentu |
| 3. | Пісьменнік павінен жадаць малой колькасці чытачоў (пэўна столькі, каб пракарміць сям'ю). Вялікая колькасць чытачоў сведчыць аб модзе, якая праміnae, а малая- якасці кніжак. | 2 | 1 | 1- za podanie ilości |
| 4. | а) напр. героі кнігі / постаці, якія выступаюць у кнізе;<br>б)постаці, героі, асобы | 2 | 1 | 1- za samą definicję bądź za same synonimy |
| 5. | Літаратура гэта від мастацтва, асновай яе ёсць штосьці апісанае. Журналістыка- від абслугоўвання, асновай якога ёсць апісанне рэчаіснасці. | 2 | 1 | 1- za pełne wyjaśnienie jednego zagadnienia i częściowe drugiego |
| 6. | Тое, што яны ствараюць толькі дзеля запаўнення нішаў у народнай літаратуры, а не доследам сваёй ўласнай асобы. | 1 | | |
| 7. | Гэты недахоп выклікае тое, што ў беларускай літаратуры дасюль не было сусветнай знакамітасці, а таксама тое, што сучасны чытач не атрымлівае таго, чаго чакае ад мастацкай кнігі. | 1 | | |
| 8. | Інфармацыі, забаву, нагоды для разважанняў на актуальныя тэмы, узрушэнне і задуму. | 1 | | |
| 9. | а) літаратурападобны, калялітаратурны, квазілітаратурны.<br>б) Усе прыметнікі абазначаюць штосці не да канца літаратурнае, якое толькі знешне адносіцца да літаратуры. | 2 | 1 | 1- za wyszukanie przymiotników |
| 10. | б | 1 | | |

**Część II – pisanie własnego tekstu**

**Temat 1:**
**Analizując i interpretując fragmenty opowiadania Jana Barszczewskiego „Biała sroka” („Biełaja saroka”), zwróć uwagę na sposób ukazania zła w utworze.**

| | Kryteria oceny argumentacji tematu | | Punktacja 25 |
|---|---|---|---|
| **1. Argumentacja tematu** | 1. | Określenie charakteru utworu (zwrócenie uwagi na jego ludowość / mitologiczność / legendarność, alegoryczność przesłania) | 0 –1 |
| | 2. | Identyfikacja głównych postaci utworu:<br>- Skamarocha- chciwy szlachcic, skłócony z sąsiadami<br>- posłaniec Białej Sroki- zły duch<br>- Biała Sroka- władczyni północnego kraju, czarownica | 0 – 3 |
| | 3. | Zwrócenie uwagi na metaforyczne znaczenie postaci:<br>- Skamarocha- ciemiężyciel, zły pan, tyran, gotów wszystko poświęcić dla pieniędzy<br>- posłaniec Białej Sroki- kusiciel, pozorny przyjaciel<br>- Biała Sroka- alegoryczne wcielenie zła | 0 – 3 |
| | 4. | Określenie kwestii dobra i zła na poziomie treści utworu:<br>- wspólna walka poszkodowanych ze złem<br>- zwycięstwo dobra (czarownica opuściła kraj, Skamarocha zmienił się w niedźwiedzia)<br>- różne postaci zła, solidarnie działające | 0 – 3 |
| | 5. | Zwrócenie uwagi na sposoby budowania nastroju:<br>- elementy przyrody: wiatr, burza, noc<br>- symbolika kolorów (czarny pies, biała sroka)<br>- gra światła i cienia (świeca, lustro, cienie postaci)<br>- dialogi między bohaterami (powtórzenia jak zaklęcia) | 0 – 3 |
| | 6. | Wskazanie elementów mitologii ludowej:<br>- wiara w złe moce<br>- wiara w przesądy (biała sroka jako zapowiedź nieszczęścia)<br>- znaczenie święta kupały dla walki ze złymi duchami<br>- wiara w czary | 0 – 3 |
| | 7. | Zwrócenie uwagi na formę utworu:<br>- dialog narratora (szlachcica Zawalni) ze słuchaczami (zwroty do słuchaczy, np. „wy, panowie”, ich pytania)<br>- prosty język i niewyszukane słownictwo<br>- dynamizacja akcji poprzez wprowadzenie dialogów | 0 – 3 |
| | 8. | Wprowadzenie kontekstu społeczno-historycznego:<br>- określenie miejsca i czasu akcji (ziemia Połock, XIX wiek)<br>- zwrócenie uwagi na rozwarstwienie społeczeństwa i jego znaczenie (zły szlachcic, dobry / mądry / sprytny lud)<br>- odniesienie tematyki do sytuacji na ziemiach białoruskich po rozbiorach Rzeczypospolitej | 0 – 2 |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | 9. | Przedstawienie wniosków:<br>- pełne- podkreślenie alegoryczności postaci, powiązań treści z folklorem, próba interpretacji utworu w kontekście społeczno-historycznym (potępienie kolaborujących przedstawicieli szlachty, wiara w prosty lud, w odrodzenie kraju)<br>- częściowe- wskazanie na alegoryczność postaci, związki z folklorem<br>- próba podsumowania- zwrócenie uwagi na różne ujęcia zła w utworze (różne postacie je reprezentujące) | 4<br><br><br><br>(2)<br><br>(1) |

| **2. Język** | **Kryteria oceny języka i kompozycji** | **20** |
|---|---|---|
| a) składnia i fleksja | | **6** |
| | Poprawna i nie schematyczna składnia i poprawna fleksja. | 6 |
| | Na ogół poprawna składnia i fleksja. | 4 |
| | Mimo błędów składnia i fleksja nie zakłócająca komunikatywności języka. | 2 |
| b) słownictwo, frazeologia, styl | | **8** |
| | Bogate i zróżnicowane słownictwo i poprawna frazeologia, swobodny i żywy styl. | 6 |
| | Na ogół wystarczające słownictwo, poprawna frazeologia, komunikatywny styl. | 4 |
| | Na ogół poprawne słownictwo i na ogół komunikatywny styl | 2 |
| c) ortografia, interpunkcja | | **4** |
| | Na ogół bezbłędna ortografia, na ogół poprawna interpunkcja. | 4 |
| | Błędy ortograficzne z przewagą drugorzędnych i interpunkcyjne. | 2 |
| **3. Kompozycja** | | **2** |
| | Funkcjonalna wobec tematu, spójna, logiczna. | 2 |
| | Trójdzielna, spójna, graficzne wyodrębnienie głównych części. | 1 |

**Temat 2:**
**Porównaj sposób ujęcia motywu rozstania z ojczyzną i powrotu do domu w wierszach *Bocian* (*Busieł*) Władysława Syrokomli i *Do ciepłych krajów* (*U wyraj*) Janki Kupały.**

<table>
<tr><td rowspan="7">1. Argumentacja tematu</td><td colspan="2">Kryteria oceny argumentacji tematu</td><td>Punktacja 25</td></tr>
<tr><td>1.</td><td>Dostrzeżenie podobieństw utworów:<br>● określenie typu liryki (patriotyczna),<br>● sytuacja liryczna: liryka wyznania, monolog,<br>● wskazanie na topos wędrówki i powrotu,<br>● wskazanie na podobieństwo przestrzeni poetyckiej (ziemia białoruska, jesień, odlot ptaków), - 2 pkt<br>● nazwanie uczuć: smutek z powodu rozstania, niepokój o los swój i najbliższych, tęsknota i przywiązanie do ziemi ojczystej – 2 pkt</td><td>0 – 6</td></tr>
<tr><td>2.</td><td>Wskazanie na wzajemne powiązania i wpływy kultury polskiej i białoruskiej (kontekst białoruski wiersza Syrokomli).</td><td>0 – 1</td></tr>
<tr><td>3.</td><td>Zinterpretowanie tytułu każdego z wierszy:<br>● wskazanie na symboliczne znaczenie tytułów,<br>● zwrócenie uwagi na symbolikę wyrazu „wyraj”.</td><td>0 – 2</td></tr>
<tr><td>4.</td><td>Dostrzeżenie różnic między tekstami:<br>● wiersz Bocian (tłumaczenie), wiersz Do ciepłych krajów (oryginalny tekst),<br>● struktury: w wierszu Syrokomli – połączenie bezosobowego opisu sytuacyjnego z monologiem (cytowanie myśli bociana); w wierszu Kupały – bezosobowa refleksja na temat przywiązania do ojczyzny (zwrot do lecących gęsi),<br>● przesłania: np. w wierszu Kupały oprócz motywów przywiązania, tęsknoty i miłości do ziemi ojczystej pojawia się motyw zdrady, wyrzeczenia się Białorusi – 2 pkt<br>● języka: np. kolokwialność monologu w wierszu Syrokomli, Do ciepłych krajów J. Kupały wykorzystanie typowych dla twórczości ludowej wykrzykników i zdrobnień. – 2 pkt</td><td>0 – 6</td></tr>
<tr><td>5.</td><td>Identyfikacja użytych przez poetów środków stylistycznych i określenie ich funkcji:<br>- epitetów<br>- metafor<br>- apostrof<br>- personifikacji<br>- symboli</td><td>0 – 4</td></tr>
<tr><td>6.</td><td>Problem powrotu do domu:<br>- w wierszu Kupały- dowód na wierność ojczyźnie, pochowanie w ziemi ojczystej<br>- w wierszu Syrokomli- marzenie (odlot jako konieczność, dom- wszystko, co najlepsze)</td><td>0 – 2</td></tr>
</table>

| | | | |
|---|---|---|---|
| | 7. | Wniosek:<br>●**pełny:** np. dostrzeżenie patriotycznego charakteru obu wierszy, podobieństwa kreacji obrazu ojczyzny i określenia uczuć towarzyszących rozłące z krajem, rozpoznanie znaczenia symboli: bociana, gęsi, ciepłych krajów oraz wskazanie na polski i białoruski kontekst porównywanych wierszy,<br>●**częściowy: w**skazanie na symboliczne ujęcie tematu rozłąki i przywiązania do kraju, na idylliczność wspomnień o ziemi ojczystej,<br>●**próba podsumowania:** lakoniczne stwierdzenie, że wiersze poświęcone są problematyce rozłąki z ojczyzną. | 4<br><br><br><br><br><br>(2)<br><br><br>(1) |

| **2. Język** | **Kryteria oceny języka i kompozycji** | **20** |
|---|---|---|
| a) składnia i fleksja | | **6** |
| | Poprawna i nie schematyczna składnia i poprawna fleksja. | 6 |
| | Na ogół poprawna składnia i fleksja. | 4 |
| | Mimo błędów składnia i fleksja nie zakłócająca komunikatywności języka. | 2 |
| b) słownictwo, frazeologia, styl | | **8** |
| | Bogate i zróżnicowane słownictwo i poprawna frazeologia, swobodny i żywy styl. | 6 |
| | Na ogół wystarczające słownictwo, poprawna frazeologia, komunikatywny styl. | 4 |
| | Na ogół poprawne słownictwo i na ogół komunikatywny styl | 2 |
| c) ortografia, interpunkcja | | **4** |
| | Na ogół bezbłędna ortografia, na ogół poprawna interpunkcja. | 4 |
| | Błędy ortograficzne z przewagą drugorzędnych i interpunkcyjne. | 2 |
| **3. Kompozycja** | | **2** |
| | Funkcjonalna wobec tematu, spójna, logiczna. | 2 |
| | Trójdzielna, spójna, graficzne wyodrębnienie głównych części. | 1 |





**Centralna Komisja Egzaminacyjna**
ul Łucka 11, 00-842 Warszawa
tel. 022 656 38 00, fax 022 656 37 57
www.cke.edu.pl  ckesekr@cke.edu.pl

**OKE Gdańsk**
ul. Na Stoku 49, 80-874 Gdańsk,
tel. (0-58) 320 55 90, fax.320 55 91
www.oke.gda.pl  komisja@oke.gda.pl

**OKE Łódź**
ul. Praussa 4, 94-203 Łódź
tel. (0-42) 634 91 33 s: 664 80 50/51/52
fax. 634 91 54
www.komisja.pl  komisja@komisja.pl

**OKE Jaworzno**
ul. Mickiewicza 4, 43-600 Jaworzno
tel.(0-32) 616 33 99 w.101
fax.616 33 99 w.108, www.oke.jaw.pl
oke@oke.jaw.pl

**OKE Poznań**
ul. Gronowa 22, 61-655 Poznań
tel.(0-61) 852 13 07, 852 13 12, fax. 852 14 41
www.oke.poznan.pl
sekretariat@oke.poznan.pl

**OKE Kraków**
al. F. Focha 39, 30-119 Kraków
tel.(0-12) 618 12 01/02/03, fax.427 28 45
www.oke.krakow.pl  oke@oke.krakow.pl

**OKE Warszawa**
ul. Grzybowska 77, 00-844 Warszawa
tel. (0-22) 457 03 35, fax. 457 03 45
www.oke.waw.pl  info@oke.waw.pl

**OKE Łomża**
ul. Nowa 2, 18-400 Łomża
Tel/fax. (0-86) 216 44 95
www.okelomza.com
sekretariat@oke.lomza.com

**OKE Wrocław**
ul. Zielińskiego 57, 53-533 Wrocław
tel. sek. (0-71) 785 18 52, fax. 785 18 73
www.oke.wroc.pl  sekret@oke.wroc.pl